Беларускі фальклор

энцыклапедыя

2

Л–Я

Мінск
«Беларуская энцыклапедыя»
2006

ваць да людзей не забываць» (з казкі «Бортнік» у запісе А.Сержпутоўскага).

Ш. выступае прыкметай фалькл. стылізацыі і фалькларызму. У функцыі толькі захавання вершаванай (рытмізаванай) формы ў аўтарскую літаратуру не пераносіцца.

Літ.: Карскі Я.Ф. Беларусы. Мн., 2001. С. 319, 347—348, 370, 382; Ліс А.С. Жніўныя песні. Мн., 1993. С. 173, 187, 213, 228.

В. М. Ляшук.

ШМАТПРЫНАЗО́ЎНІКАВАСЦЬ, стылістычны фалькл. прыём, заснаваны на паўтарэнні ў тэксце адных і тых жа прыназоўнікаў з рытмічнай, вершаўтваральнай, эстэтычнай і інш. мэтамі. У фалькл. тэксце Ш. звязана з найбольш старажытнымі нематываванымі прыназоўнікамі па, на, з, пад, пры і да т.п. Спецыфічнай адзнакай фалькл. стылю з'яўляецца паўтарэнне прыназоўніка пры азначэнні і азначальным слове (пры назоўніку і залежным ад яго прыметніку). Гэта традыцыйная форма Ш.:

Хадзіў спарыш па вуліцы,
Па вуліцы **па** шырокай,
Па мураўцы **па** зялёнай.
А ніхто спарыша ў двор не завець...
(Са жніўнай песні)

Гэй, збірайся, хлопцы жвавыя,
На расправы, **на** крывавыя...
(З бурлацкай песні)

Пыл, пыл **па** дарозе,
Пыл, пыл **па** шырокай,
Дым, дым **па** дуброве,
Дым, дым **па** зялёнай —
Шчыр бор выгарае...
(З пазаабрадавай песні)

Ш. утварае своеасаблівы рытм і сіметрычнасць у моўных канструкцыях: «**Што за** месяц, **што за** ясны...». У фалькл. тэкстах выкарыстоўваецца і універсальны прыём паўтарэння прыназоўніка толькі пры назоўніку — у аднатыпных граматычных канструкцыях, што можа быць звязана з класічным тыпам паўтору — анафарай:

Мы заўём вяночкі
На годы добрыя,
На жыта густое,
На ячмень каласісты.
На авёс расісты,
На грэчку чорную,
На капусту белую.
(З кустовой песні)

Ш. у бел. паэтычных фалькл. тэкстах выкарыстоўваецца ў невялікіх фрагментах, можа быць прадстаўлена некалькімі прыназоўнікамі і выконваць фалькл. стылеўтваральную, тэкстаўтваральную і вылучальную функцыі:

Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Вазьмі ж, ваша, нову сошку
Да й коніка варанога,
Варанога, маладога,
Едзь жа, ваша, у чыста поле,
У чыста поле заарываць
З соллю, **з** хлебам, **з** белым яйцом,
З белым яйцом, **з** боскім слаўцом...
Сядзь жа, ваша, на скам'іцу.
І з жаною **з** маладою,
І з дзеткамі маленькімі,
Шасні, бразні па скам'іцы...
Няхай ідзець твая жана
У чыста поле жытцо жаці
З ячным блінам, **з** белым сырам.
З белым сырам, **з** трэцім сынам...
— Дай жа, Божа. Зарадзі, Божа,
У пуні кладам, **на** таку ўмалотам,
У дзяжы падходам, **у** печы ростам,
У печы ростам, **на** стале насытам...
(З валачобнай песні)

Ш., выступаючы дыферэнцыяльнай прыкметай *стылю фальклорнага*, выкарыстоўваецца пры фалькл. стылізацыі, захоўваецца ў фалькларызме і ў традыцыйнай форме не ўласціва мастацкай літаратуры.

Літ.: Гілевіч Н.С. Наша родная песня. Мн., 1968. С. 26—27; Ліс А.С. Жніўныя песні. Мн., 1993. С. 130.

В. М. Ляшук.

ШНАРКЕ́ВІЧ Надзея Маркаўна (12.10.1897, Брэст—21.5.1974), культурна-грамадскі дзеяч, краязнавец, збіральніца фальклору. Скончыла Пружанскую жаночую гімназію (1914), педагагічныя курсы (1919). З 1914 настаўнічала ў Пружанскім павеце, з 1915 у бежанстве (г. Сызрань, Расія), з 1919 на радзіме. З 1925 загадчыца дзіцячага прытулка-інтэрната пры Віленскай бел. гімназіі, супрацоўнік Гал. управы Таварыства бел. школы. Удзельнічала ў стварэнні Бел. жаночай арганізацыі імя Цёткі (А.Пашкевіч), выданні часопіса «Жаноцкія справы». У 1970-я г. збірала матэрыял пра бел. школьніцтва ў Зах. Беларусі. Запісала фальклор ад нар. спявачкі К.Асіповіч з в. Маркава Маладзечанскага раёна, у т.л. вясельны абрад і яго вербальнае суправаджэнне, якія ўвайшлі ў серыі тамоў БНТ: «Вяселле» (1978), «Вяселле: Песні» (кн. 2—4, 1981—85; кн. 6, 1988). За-

пісы хрэсьбіннага абраду і яго песен-нае суправаджэнне, зробленыя Ш., за-хоўваюцца ў архіве Інстытута мастац-твазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі.

А.С. Ліс.

ШНІП Віктар Анатолевіч (н. 26.3.1960, в. Пугачы Валожынскага р-на), паэт, эсэіст, перакладчык, крытык. Вучыўся ў Мінскім архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме (1975—78). Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1987). У першых яго зборніках фалькл. пачатак апасродкаваны і праяўляецца найперш у паэтыцы, структуры паэтычнага радка. У наступных зборніках Ш. працягвае мастацкі эксперымент, пачаты Я.Баршчэўскім у 19 ст., а затым узмоцнены Я.Купалам і М.Багдановічам у пачатку 20 ст. Свядомую арыентацыю на найбольш старажытныя пласты фальклору падкрэслівае аўтарскае свядомае жанравае вызначэнне паасобных твораў — казка, паданне, ці ўвасабленне персанажаў нар. дэманалогіі і міфалогіі, развіццё сэнсу і вобразнай сістэмы нар. прыказак, прымавак, павер'яў і ўяўленняў. Па-свойму Ш. інтэрпрэтуе вобразы змагароў з цмокамі («Казка пра волата»), уяўленні пра валуны («Казка пра іголку»), змеяў («Залатая карона змяі»), ворана, сабакі, ваўкалака, зачараванай царэўны, дамавіка, выхад героя з магілы. З нар. светаўспрыманнем звязана і выразна анімістычнае ўспрыняцце свету (рабіна плача над героем, дрэвы гуляюць па начным горадзе). Пад уплывам нар. песеннай лірыкі напісаны і многія песні Ш.

Літ.: Штэйнер І.Ф. Deja vu, або Успамін пра будучыню. Мн., 2003. С. 97—113; Бароўская І.А. Усе мы родам з дзяцінства: (Песенная лірыка В.Шніпа) // Бароўская І.А. Паэтыка беларускай песеннай лірыкі. Мн., 2003.

І. Ф. Штэйнер.

ШПІЛЕЎСКІ Павел Міхайлавіч (12.11.1823, в. Шыпілавічы Бабруйскага р-на — 29.10.1861), бел. і рускі этнограф, фалькларыст, пісьменнік, журналіст, публіцыст. Кандыдат багаслоўя (1847). Вучыўся ў Слуцкім духоўным вучылішчы, у Мінскай духоўнай семінарыі (1843), у Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі (1847). Друкаваўся пад псеўданімамі Драўлянскі, Знакомы чалавек, Барон Ікс. Даследаваў і папулярызаваў фальклор, міфалогію, этнаграфію і гісторыю Беларусі. Апублікаваў кн. «Беларускія паданні» (1846—52), у якой у алфавітным парадку прадстаўлены апісанні 52 багоў і духаў. Міфалагічным паданням прысвечана «Даследаванне пра ваўкалакаў на аснове беларускіх павер'яў» (1853). Даследаваў малыя жанры фальклору: прыказкі, прымаўкі, прыкметы, параўнанні, праклёны, прыгаворкі, вясельныя пажаданні, блаславенні, выслоўі («Народныя прыказкі, з тлумачэннем паходжання і значэння іх», 1852, «Беларускія прыказкі», 1853). У працы «Вясельная абраднасць у засцянкоўцаў (акалічан) Віцебскай губерні» (1854) выявіў старажытныя рысы абраду Вяселля. Аўтар нарысаў і артыкулаў «Апісанне пасольства Льва Сапегі ў Маскве ў 1600 г.» (1850), «Мазыршчына: (З падарожжа па заходнярускім краі» (1859), «Паездка ў заходнія губерні» (1860). Рабіў спробу стварэння слоўніка і граматыкі бел. мовы («Слоўнік і караняслоў беларускай гаворкі», 1845; у рукапісе). Найбольшую папулярнасць Ш. прынеслі цыклы белетрызаваных нарысаў, апублікаваных у рус. перыядычным друку. Асабліва адметны нарыс «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі» (1853—55), у якім змешчаны этнаграфічныя і фалькл. матэрыялы, апісанні бел. гарадоў і мястэчак (Брэст, Кобрын, Клецк, Нясвіж, Барысаў, Чэрвень, Шчорсы, Мір, Заслаўе, Смалявічы, Халопенічы, Мінск і інш.). У нарысе «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках» (1853—54, 1856) апісанне сямейна-бытавых абрадаў і звычаяў, прадстаўленне чарадзейных казак; змяшчае інфармацыю пра бел. кірмаш, калядныя вячоркі, валачобнікаў, абрады вясельныя жыхароў Магілёўскай і Мінскай губерняў, сялян Віцебскай і Мінскай губерняў пры ўборцы збожжа з палёў, Радзіны, Хаўтуры і Памінкі. Аўтар драматургічнага твора «Дажынкі: Беларускі народны звычай. Сцэнічнае прадстаўленне ў двух дзеях з хорамі, песнямі, карагодамі і танцамі беларускімі» (1857). Выступаў у абарону самастойнасці бел. мовы, лічыў яе літаратурна развітай, выявіў яе дамінуючае значэнне ў ВКЛ. Даследаваў гісторыю, мову і фальклор літоўскага народа («Нарысы Жмудзі», 1855).

Тв.: Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Мн., 1992.